*Ірына Сушчынская*

# ВЫКАРЫСТАННЕ АЎТЭНТЫЧНЫХ ФОРМ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ВЫКЛАДАННІ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

У сучасным грамадстве паслабляюцца і паступова перастаюць выконваць сваю функцыянальную ролю асноўныя механізмы міжпакаленнай трансляцыі, вынікам чаго з'яўляецца вызначэнне адукацыі як галоўнага транслятара духоўнай спадчыны народа, а таксама як мэтанакіраванага інстытута этнасу прызначанага забяспечваць пераемнасць пакаленняў, захаванне і развіццё роднай мовы і этнакультурных традыцый. У сувязі з гэтым сёння да асноўных функцый адукацыі далучаецца яшчэ адна, зусім не характэрная для ўстаноў адукацыі функцыя этнізацыі і этнакультурацыі, галоўнай мэтай якой выступае пераўтварэнне асобы са спажывальніка культурнай традыцыі ў яе актыўнага носьбіта і творцу.

Адной з самых значных адукацыйных устаноў, якая ажыццяўляе працэс этнакультурнай адукацыі і выхавання асобы, з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў. Акрамя таго, што ва універсітэце здзяйсняецца падрыхтоўка спецыялістаў этнакультурнага профілю, для студэнтаў усіх спецыяльнасцей і ўсіх форм навучання вучэбнымі планамі ВНУ прадугледжана вывучэнне этнакультурных дысцыплін, выкладанне якіх ажыццяўляецца ў асноўным выкладчыкамі кафедры этналогіі і фальклору. Так, абавязковымі дысцыплінамі на першых курсах з'яўляюцца «Міфалогія беларусаў», «Беларускі фальклор» і «Этнаграфія беларусаў», акрамя іх на некаторых факультэтах выкладаюцца «Этнасеміётыка», «Беларускі народны каляндар», «Сямейна-родавыя святы» і інш. Галоўнай мэтай і вынікам вывучэння гэтых курсаў з'яўляецца павышэнне этнакультурнай кампетэнтнасці будучых спецыялістаў, а асноўным зместам выступае ўсё багацце нацыянальнай культуры, асаблівасці ўкладу жыцця беларускага народа, яго традыцыі, сацыяльныя нормы паводзін і духоўна-маральныя каштоўнасці.

Неабходнай і абавязковай умовай трансляцыйнага працэсу з'яўляецца выкарыстанне аўтэнтычных форм традыцыйнай культуры ў навучальна-выхаваўчай дзейнасці ВНУ.

Па-першае, гэта дазволіць ажыццяўляць этнакультурную адукацыю на больш якасным і прафесійным узроўні, па-другое, ва ўмовах паступовай страты механізмаў самазахавання і самаразвіцця фальклору, дазволіць падоўжыць жыццё традыцыі і хаця б часткова перадаць яе падрастаючаму пакаленню.

Аўтэнтычныя формы традыцыйнай культуры - гэта ўсе віды матэрыяльнай і нематэрыяльнай дзейнасці народа, якія існуюць у іх спрадвечным натуральным выглядзе без якіх-небудзь змяненняў і апрацовак і перадаюцца ад пакалення пакаленню вусным шляхам праз носьбітаў і творцаў фальклору.

Паколькі на сённяшні момант аўтэнтычныя формы беларускай традыцыйнай культуры існуюць яшчэ як у зафіксаваным, так і жывым выглядзе, у навучальна-выхаваўчым працэсе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і асабліва ў выкладанні этнакультурных дысцыплін яны выкарыстоўваюцца разнастайнымі шляхамі і спосабамі.

На лекцыйных і семінарскіх занятках студэнты знаёмяцца са славеснымі, музычнымі, абрадавымі і іншымі відамі аўтэнтычнага фальклору пры дапамозе аўдыё-, відэа- і фотаматэрыялаў, а таксама пісьмовых (друкаваных) і графічных крыніц. Для гэтага на кафедры этналогіі і фальклору сабрана калекцыя аўдыё- і відэакасет з запісамі розных аспектаў беларускай народнай культуры, створаны комплексы дыдактычнага этнаграфічнага матэрыялу. Таксама пры кафедры працуюць Цэнтр захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Адвечнае», віртуальны музей беларускіх абярэгаў і музей традыцыйнай беларускай культуры, дзе студэнты могуць пазнаёміцца з побытам беларусаў, дакрануцца да рэчаў, якія акружалі і былі створаны нашымі продкамі. Разам з гэтым факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва арганізуюцца пастаянныя канцэрты і творчыя сустрэчы з выканаўцамі і творцамі аўтэнтычнага фальклору, што прадугледжвае пераемнасць традыцый натуральным шляхам праз непасрэдны кантакт з жывымі носьбітамі.

Яшчэ адным спосабам выкарыстання аўтэнтычнага фальклору беларусаў у выкладанні этнакультурных дысцыплін з'яўляецца арганізацыя інавацыйных форм самастойнай работы студэнтаў і кантрольных работ слухачоў завочнага навучання. Так, разам з традыцыйным напісаннем рэфератыўных работ і тэсціраваннем студэнты апісваюць этнакультурныя асаблівасці пэўнай мясцовасці, распрацоўваюць комплексы дыдактычнага этнаграфічнага матэрыялу, ствараюць камп'ютэрныя прэзентацыі, збіраюць фальклорны і этнаграфічны матэрыял, чым папаўняюць аўдыё-, відэа- і музейныя архівы кафедры.

Сапраўдным дасягненнем апошніх гадоў з'яўляецца адкрыццё на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва новых спецыяльнасцей, якія непасрэдна звязаны з вывучэннем аўтэнтычнага фальклору, гэта спецыяльнасці «Народная творчасць» спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» і «Абрадазнаўства». Іх будучыя выпускнікі - гэта не толькі спецыялісты ў галіне багацейшай этнакультурнай традыцыі беларускага народа, а і навукоўцы, даследчыкі, транслятары, носьбіты і творцы народнай творчасці Беларусі.

Неабходна адзначыць, што рэалізацыя разнастайных шляхоў выкарыстання аўтэнтычнага фальклору дае розную якасць яго засваення і захавання, што залежыць не толькі ад спосабу перадачы народных традыцый, а яшчэ і ад многіх іншых фактараў, сярод якіх можна назваць і гнастычны, і матывацыйны, і тэхнічны, аднак нягледзячы на гэта, ажыццяўленне працэсу трансляцыі этнакультурнага вопыту ў навучальных установах дазволіць стварыць умовы для існавання і пераемнасці беларускай традыцыйнай культуры, а таксама для фарміравання і развіцця якасна новай характарыстыкі будучых спецыялістаў - этнакультурнай кампетэнтнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ